РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ВЕРАСНЯ 2025 г. АЎТОРАК № 168 (30556)

# «БЫЦЬ ЧАСТКАЙ «ШАНХАЙСКАЙ СЯМ'І» — НАШ СТРАТЭГІЧНЫ ВЫБАР»



**Беларускі лідар прыняў удзел у саміце ШАС**

Саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, які праходзіць у Цяньцзіне, мае вялікае значэнне як для глабальнай палітыкі ў цэлым, так непасрэдна і для Беларусі. Гэта першы саміт магутнай і перспектыўнай арганізацыі, на якім Беларусь удзельнічае як паўнавартасны член вялікай сям'і ШАС. У дзясятку краін — членаў ШАС Беларусь уваходзіць разам з Індыяй, Іранам, Казахстанам, Кітаем, Кыргызстанам, Пакістанам, Расіяй, Таджыкістанам і Узбекістанам. Сёлетні саміт — самы маштабны ў гісторыі аб'яднання. СТАР. 2–5

Фота БелТА.

ВУЧЭННІ АДКБ НА ПАЛІГОНЕ «ЛЕПЕЛЬСКІ» 12



ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА ІДЗЕ Ў ЛІДУ 15

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

АДУКАЦЫЯ

## ШЛЯХ У ВЯЛІКАЕ ЖЫЦЦЁ

**Учора за школьныя парты села больш за мільён юных грамадзян**



Фота БелТА.

Новы навучальны год пачаўся з урока «Эстафета пакаленняў: захоўваючы мінулае, ствараем будучыню». Для наваабранцаў школьнага жыцця — першакласнікаў — па традыцыі было зладжана свята першага званка.

1 верасня — не проста дата ў календары, гэта рубеж. Дзень ведаў сімвалізуе пачатак новага навучальнага года, свежых надзей і адкрыццяў. Для школьнікаў гэта крок у будучыню, для студэнтаў — новы віток жыцця, для бацькоў і настаўнікаў — радасць і хваляванне за дзяцей. І не так ужо і важна, з чаго пачынаецца 1 верасня — з урока ці ўрачыстага мерапрыемства. Важна тое, што гэта свята для кожнага з нас мае вялікі сэнс, бо для чалавека адна з самых галоўных каштоўнасцяў — веды. Працэс пазнання невычэрпны, а шлях да яго складаны, але гэты шлях — у вялікае жыццё. Першакласнікі будуць толькі вучыцца ўсведамляць гэта, старшакласнікі — працягваць па гэтым шляху ісці з пачуццём адказнасці і разумення. Настаўнікі, набраўшыся сіл, цярпення і абавязкова творчага натхнення, будуць дапамагаць дзецям пераадольваць усе цяжкасці, разам з імі радавацца перамогам і падштурхоўваць да новых вяршынь. СТАР. 8-9

ISSN 1990 — 763X

# «БЫЦЬ ЧАСТКАЙ «ШАНХАЙСКАЙ СЯМ'І»

## Беларускі лідар прадставіў пазіцыю і планы нашай дзяржавы

### АДЗІНСТВА І ЗГУРТАВАНАСЦЬ — НАШЫ НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПЕРАВАГІ

Пазіцыю Беларусі і планы нашай дзяржавы на новы этап у міжнароднай палітыцы на саміце ШАС у Цяньцзіне прадставіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Беларускі лідар канстатаваў, што цяпер вельмі няпросты час, калі адбываецца фарміраванне новага міжнароднага парадку: «Свет імкліва рухаецца ад аднапалярнай мадэлі — з яе прэтэнзіяй на выключнасць і дамінаванне пэўнай групы краін — да справядлівай шматпалярнай сістэмы, заснаванай на балансе інтарэсаў, павазе суверэнітэту і ўзаемным даверы. Такі пераходны перыяд спалучаны з вострымі супярэчнасцямі і канфліктамі. Мы бачым гэта ў розных рэгіёнах, у тым ліку і на Блізкім Усходзе, дзе захоўваюцца сур'ёзныя рознагалоссі паміж ключавымі гульцамі, напоўненыя рызыкамі для ўсёй нашай планеты».

Аляксандр Лукашэнка перакананы: у шэрагу выпадкаў росту антаганізму і канфрантацыі можна было б пазбегнуць, бо часта яны ўзнікаюць з-за трывіяльнай адсутнасці зносін на патрэбным узроўні і ў патрэбнай танальнасці. Прэзідэнт заўважыў, што, на жаль, не ўсе супярэчнасці абыходзяць бокам і «шанхайскую сям'ю». «Але менавіта здольнасць захоўваць адкрытымі каналы камунікацыі, уменне дамаўляцца нават пры наяўнасці адрозненняў — тое, што ШАС робіць па-сапраўднаму ўнікальнай і жыццяздольнай арганізацыяй. Ва ўмовах нестабільнай сусветнай абстаноўкі адзінства і згуртаванасць — нашы найважнейшыя перавагі. Як казаў Канфуцый, «калі людзі аб'яднаныя, нават слабыя становяцца моцнымі; калі яны раз'яднаныя, нават моцныя слабеюць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Беларусь ганарыцца тым, што год таму стала паўнапраўным удзельнікам ШАС. Гэта адпавядае карэнным доўгатэрміновым інтарэсам нашай дзяржавы і адкрывае дадатковыя перспектывы і шырокія сферы супрацоўніцтва. Быць часткай «шанхайскай сям'і» — наш стратэгічны выбар», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт канстатаваў, што сёння ШАС па праве лічыцца адной з самых прадстаўнічых і ўплывовых міжнародных арганізацый Еўразіі. Таму, па яго словах, заканамерна: у арганізацыю імкнуцца новыя дзяржавы.

> **«Мінск падтрымлівае пашырэнне ШАС за кошт новых членаў і партнёраў. Тых, хто без агаворак падзяляе каштоўнасці і аснову «шанхайскага духу»: узаемная павага і давер, роўнасць, дыялог, імкненне да агульнага развіцця», — запэўніў беларускі лідар.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва становіцца неад'емным элементам новага міжнароднага парадку.

**У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы пазначыў ключавыя пытанні дзейнасці ШАС, якія патрабуюць, на погляд беларускага боку, узмоцненай увагі.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




### Стварэнне механізмаў непадзельнай бяспекі ў Еўразіі

Прэзідэнт нагадаў, што Беларусь прапанавала распрацаваць Еўразійскую хартыю разнастайнасці і шматпалярнасці ў XXI стагоддзі і бачыць менавіта ШАС у якасці адной з асноўных пляцовак для абмеркавання гэтай ініцыятывы. «Беларусь таксама вітае работу па стварэнні ўніверсальнага цэнтра ШАС па процідзеянні выклікам і пагрозам бяспекі і антынаркатычнага цэнтра ШАС. Неабходна зрабіць усё магчымае, каб названыя структуры пачалі функцыянаваць у найбліжэйшы час», — сказаў Прэзідэнт.

### Спрашчэнне працэдур гандлю

Аляксандр Лукашэнка ацаніў актывізацыю дыялогу ў гэтым кірунку, што будзе садзейнічаць зніжэнню бар'ераў, росту таваразвароту і трансгранічных інвестыцый. «Ужо сёння аб'ём гандлю паміж краінамі ШАС перавысіў два трыльёны долараў, і такія лічбы не мяжа. Разлікі ў нацыянальных валютах, стварэнне сумесных фондаў, інвестыцыі ў лічбавую эканоміку і «зялёныя» тэхналогіі — усё гэта будзе ў цэнтры нашай увагі», — упэўнены ён.

### Незалежны фінансавы механізм

«У сучасных геапалітычных умовах, калі аднабаковыя санкцыі становяцца фактарам дэстабілізацыі, відавочная патрэба ў незалежным фінансавым механізме ШАС. У такім, які быў бы здольны фінансаваць трансгранічныя праекты, нівеліруючы санкцыйны ціск, стымуляваць выкарыстанне нацыянальных валют у гандлі, падтрымліваць развіццё ключавых кірункаў супрацоўніцтва: ад лагістыкі і энергетыкі да лічбавай трансфармацыі і штучнага інтэлекту», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Беларускі бок падтрымлівае ідэю стварэння Банка развіцця ШАС, які надасць дадатковую ўстойлівасць эканамічным сувязям і стане важным крокам да эканамічнага суверэнітэту рэгіёна. «Але мы ўсе разумеем, што карысць ад гэтага банка будзе толькі ў тым выпадку, калі ён зможа працаваць у кожнай з краін «шанхайскай сям'і», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

### Каардынацыя намаганняў з ЕАЭС у транспартна-лагістычнай сферы

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што геапалітычныя ўзрушэнні ламаюць міжнародныя лагістычныя ланцужкі. Таму Беларусь лічыць важным краінам ШАС і ЕАЭС скаардынаваць намаганні па развіцці транспартна-лагістычнай інфраструктуры транспартных калідораў, выкарыстоўваючы лічбавыя тэхналогіі і інтэлектуальныя сістэмы ў сферы транспарту.

> **«Гэта ўмацуе звязанасць краін — удзельніц ШАС і Еўразійскага эканамічнага саюза, знізіць транзакцыйныя выдаткі для бізнесу, пашырыць доступ краін Цэнтральнай Азіі да рынкаў Еўропы і Кітая. І, нарэшце, павысіць узровень устойлівасці і бяспекі лагістычных ланцужкоў паставак ва ўмовах знешняга ціску», — адзначыў беларускі лідар.**

### Стварэнне агульнай навукова-інавацыйнай прасторы

Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь лічыць вельмі важным стварэнне агульнай навукова-інавацыйнай прасторы ШАС. Ён звярнуў увагу: ужо сёння ёсць механізмы — ад рабочых груп да міжбанкаўскага аб'яднання ШАС, — якія могуць забяспечыць фінансаванне сумесных навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ і тэхналагічных стартапаў. Гэта асабліва актуальна, калі інавацыі становяцца ключавым фактарам устойлівага росту. «Беларусь адкрыта да абмену вопытам і рэалізацыі сумесных праектаў у галіне сельскай гаспадаркі, медыцыны, IT і прыкладных навук», — заявіў Прэзідэнт.

### Гуманітарнае вымярэнне супрацоўніцтва

«Мы надаём вялікае значэнне ўмацаванню сувязяў паміж краінамі ШАС у сферах адукацыі, навукі і культуры. Гуманітарнае вымярэнне ШАС важна напоўніць канкрэтным зместам і новымі магчымасцямі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён прапанаваў стварыць паўнавартасную рэгіянальную адукацыйную платформу, напрыклад, на аснове ўніверсітэта ШАС. І на гэтай пляцоўцы праз праграмы ШАС фарміраваць пакаленне спецыялістаў — людзей, якія ведаюць адно аднаго, паважаюць культурныя асаблівасці і дасягненні краін-партнёраў. «Гэта значыць, свайго роду «народных дыпламатаў», якія дапамогуць культываваць на міжасобасным узроўні атмасферу даверу, сфарміраваную лідарамі краін «шанхайскай сям'і», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

### Перамога ў той вайне — важны ўклад у агульную справу міжнароднага міру

У завяршэнне свайго выступлення Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Кыргызстан з прыняццем старшынства ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Беларускі лідар таксама павіншаваў Старшыню КНР з 80-годдзем Перамогі кітайскага народа ў вайне супраціву японскай агрэсіі і заканчэння Другой сусветнай вайны. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што мерапрыемствы з гэтай нагоды якраз сведчаць аб тым, што вялікі кітайскі народ разам з дружнай сям'ёй ШАС не дасць змяніць гісторыю. «Там мы былі разам. Думаю, і ў будучыні, як калісьці савецкі і кітайскі народы разам, мы будзем гэтак жа вяршыць лёс чалавецтва», — сказаў Прэзідэнт.

«Гэты знамянальны юбілей, які разам з вамі святкуем, сімвалізуе мужнасць і стойкасць кітайскага народа ў барацьбе супраць акупацыі і несправядлівасці. Перамога ў той вайне — не толькі нацыянальны гонар Кітая, але і важны ўклад у агульную справу міжнароднага міру і бяспекі. Ад усёй душы жадаю Кітаю росквіту, дабрабыту і далейшых поспехаў у пабудове гарманічнай і ўстойлівай будучыні», — дадаў беларускі лідар.

# — НАШ СТРАТЭГІЧНЫ ВЫБАР»

## на новы этап у міжнароднай палітыцы на саміце ШАС

## «МЫ БУДЗЕМ АДДАНЫЯ ЗАЎСЁДЫ ПРЫНЦЫПАМ ШАС»

У міжнародным форуме ў Цяньцзіне прымаюць удзел больш за тры дзясяткі лідараў краін і кіраўнікоў міжнародных арганізацый. Частка з іх запрошаныя кітайскім бокам для ўдзелу ў саміце ў фармаце «ШАС плюс». На гэтым пасяджэнні таксама выступіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар падзякаваў Старшыні КНР за цёплы і сардэчны прыём, найвышэйшы ўзровень арганізацыі сумеснай работы, а таксама павіншаваў Кітай з паспяховым старшынствам у ШАС. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што дзякуючы паслядоўнай і выверанай рабоце пад кіраўніцтвам кітайскага боку на працягу года ў рамках арганізацыі праведзена больш за сотню мерапрыемстваў рознага ўзроўню і фармату. «Гэта значна ўмацавала ўзаемадзеянне ўнутры ШАС і спрыяла пашырэнню палітычных, эканамічных і гуманітарных сувязяў паміж краінамі-членамі», — падкрэсліў ён.

Прэзідэнт запэўніў, што Беларусь гатова падключыцца да ініцыятывы Кітая па глабальным кіраванні.

**«Паважаны спадар Сі Цзіньпін, вы толькі што вылучылі глабальную сваю чацвёртую ініцыятыву, якую вы назвалі «глабальнае кіраванне». Мы цалкам у Беларусі падтрымліваем вашу ініцыятыву. І перш за ўсё за тое, што гэта ініцыятыва заснаваная выключна на раўнапраўі і справядлівасці. Гэта тое, чаго сёння вельмі не хапае ў развіцці міжнародных адносін. Ад паважанага Старшыні Сі мы пачулі выразную ацэнку сітуацыі і ключавыя прынцыпы, абапіраючыся на якія можна вырашаць рэальныя праблемы краін і народаў: суверэнная роўнасць, прымат міжнароднага права, шматбаковасць. Мы гатовыя падключыцца да гэтай ініцыятывы і ў ШАС, і на пляцоўцы ААН», — сказаў беларускі лідар.**

Карыстаючыся выпадкам, Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Лаос з падключэннем да ШАС у статусе партнёра па дыялогу. На пасяджэнні беларускі лідар таксама павіншаваў усе міралюбныя дзяржавы з 80-годдзем агульнай перамогі ў Другой сусветнай вайне. «Гэта падзея стала паваротным момантам у глабальнай гісторыі. Мы заплацілі высокую цану дзеля свабоды і міру. Для Беларусі, якая страціла кожнага трэцяга жыхара ў гады апошняй вайны, захаванне гістарычнай памяці і павага да подзвігу пераможцаў — маральны абавязак і найважнейшы элемент нацыянальнай ідэнтычнасці. Цяпер, калі гісторыю спрабуюць падвергнуць скажэнню, а гераізм нашых продкаў — забыццю, мы асабліва выразна ўсведамляем: памяць пра перамогу — гэта падмурак, на якім павінен будавацца сучасны светапарадак», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Галоўная тэма пасяджэння ў фармаце «ШАС плюс» — увасабленне ў жыццё шматбаковасці, забеспячэнне рэгіянальнай бяспекі і садзейнічанне ўстойліваму развіццю. Прэзідэнт працытаваў Канфуцыя, які казаў: «Калі ты хочаш змяніць свет, пачні з сябе». Беларускі лідар звярнуў увагу ўдзельнікаў саміту на шэраг асноватворных прынцыпаў і прыярытэтных кірункаў сумеснай работы ў «сям'і ШАС» па стварэнні ўмоў для рэгіянальнай бяспекі і ўстойлівага развіцця.

### ШМАТБАКОВАСЦЬ

**«Мы перакананы, што толькі праз сапраўдную шматбаковасць і раўнапраўнае партнёрства, заснаваных на ўзаемнай выгадзе, можна выбудоўваць міжнародныя адносіны. Нашы агульныя мэты павінны ўвасабляцца ў канкрэтных праектах, кааперацыйных ініцыятывах і выніках, якія будуць адчувальныя выключна для ўсіх», — заклікаў Прэзідэнт.**

### ЗАБЕСПЯЧЭННЕ РЭГІЯНАЛЬНАЙ І ГЛАБАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

«Мір на еўразійскай прасторы павінен быць не марай або лозунгам, а рэальнасцю. Любыя аднабаковыя агрэсіўныя дзеянні, накіраваныя супраць суверэнных дзяржаў, непрымальныя і небяспечныя. Яны дэстабілізуюць абстаноўку і падрываюць асновы міжнароднага права. Асабліва хачу падкрэсліць, што мы падобныя канфлікты ні ў якім разе не павінны правакаваць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён выступіў за ўдасканаленне механізмаў ШАС па супрацьдзеянні пагрозам і выклікам бяспекі, а таксама за ўзмацненне каардынацыі па лініі спецслужбаў і абаронных ведамстваў. Беларусь падтрымлівае ініцыятывы ШАС па сумеснай барацьбе з тэрарызмам, кіберпагрозамі, транснацыянальнай злачыннасцю. «Менавіта краінам, якіх аб'ядноўвае «шанхайскі дух», па сілах адыгрываць актыўную ролю ў прадухіленні канфліктаў і прасоўванні мірнага дыялогу», — перакананы кіраўнік дзяржавы.

### УСТОЙЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ ЯК АСНОВА СТАБІЛЬНАСЦІ Ў РЭГІЁНЕ

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь няўхільна прытрымліваецца глабальнага парадку ўстойлівага развіцця: «Мы ў ліку першых інтэгравалі мэты ўстойлівага развіцця ААН у нацыянальную стратэгію з фокусам на чалавечы капітал, устойлівую эканоміку, экалагічную раўнавагу і лічбавую трансфармацыю».

*(Працяг на 4-й стар.)*



# «БЫЦЬ ЧАСТКАЙ «ШАНХАЙСКАЙ СЯМ'І» — НАШ СТРАТЭГІЧНЫ ВЫБАР»

## ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА

Прэзідэнт звярнуў увагу, што без харчовай бяспекі ні ў адной краіне не можа быць ніякай стабільнасці. Ён расказаў, што Беларусь цалкам забяспечвае сябе харчаваннем і займае высокія пазіцыі ў сусветным рэйтынгу экспарцёраў асноўных груп харчовых тавараў. Беларуская прадукцыя пастаўляецца больш чым у 100 краін свету.

## СУМЕСНАЕ РАЗВІЦЦЁ ПРАЗ ІНДУСТРЫЯЛЬНЫ І НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Беларусь валодае развітой прамысловай базай і кваліфікаванымі кадрамі, і заклікаў да паглыбленай прамысловай кааперацыі ў рамках «шанхайскай сям'і».

**«Прапануем развіваць сумесныя вытворчасці, абменьвацца сучаснымі тэхналогіямі, пашыраць супрацоўніцтва ў сферах машынабудавання, сельскагаспадарчай тэхнікі, транспарту, медыцыны, робататэхнікі і штучнага інтэлекту», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**

Прэзідэнт яшчэ раз падзякаваў Кітаю за вялікую дапамогу па развіцці гэтых перспектыўных кірункаў. «Выступаем за стварэнне навукова-тэхналагічных платформ, даследчых цэнтраў і адукацыйныя абмены ў рамках ШАС», — прапанаваў ён.

## ШМАТПАЛЯРНАСЦЬ УЖО НАСТУПІЛА

Аляксандр Лукашэнка таксама заявіў, што Беларусь як паўнапраўны член ШАС і надзейны партнёр гатовая дзяліцца вопытам, браць на сябе адказнасць і актыўна ўдзельнічаць у развіцці «шанхайскай сям'і». Ён асабліва адзначыў, што Беларусі, яе народу і прэзідэнту быў аказаны высокі давер стаць паўнапраўным членам ШАС. Гэта адзіная краіна — член аб'яднання, тэрыторыя якой цалкам размешчана ў Еўропе. «Запэўніваю вас, што мы будзем адданыя заўсёды прынцыпам ШАС і вы да нас ніколі не будзеце мець ніякіх прэтэнзій. Мы перакананы, што толькі праз павагу, раўнапраўе і салідарнасць зможам умацаваць рэгіянальную бяспеку, забяспечыць устойлівае развіццё і годную будучыню для народаў нашых краін», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт заўважыў, што на саміце ШАС шмат гаварылася пра шматпалярнасць і пра тое, што «вось-вось заўтра яна прыйдзе».

**«Ды не, гэтая шматпалярнасць ужо і не стукаецца ў дзверы. Яна ўжо прыйшла. І наша пасяджэнне на радзіме нашай арганізацыі гаворыць аб тым, што гэтая шматпалярнасць наступіла, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — ШАС і БРІКС становяцца сур'ёзнай процівагай. Не на шкоду іншым арганізацыям — і «сямёркам», і «дваццаткам», і гэтак далей. Мы нават не збіраемся канкурыраваць з імі. Хаця жыццё прымусіць. Мы працуем у імя нашых народаў. Гэта магутны полюс на нашай планеце. Мы павінны зрабіць усё, каб не падмануць людзей нашай планеты і не знішчыць тую надзею, якую народы сілкуюць, гледзячы на нашы арганізацыі. Перш за ўсё Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва».**

На заканчэнне кіраўнік дзяржавы яшчэ раз павіншаваў Кыргызстан з прыняццем старшынства ў ШАС на наступны перыяд і запэўніў ва ўсямернай падтрымцы з боку Беларусі.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта**
**Фота БелТА.**

## НА САМІЦЕ У ЦЯНЬЦЗІНЕ ПРЫНЯЛІ СТРАТЭГІЮ РАЗВІЦЦЯ ШАС

**По выніках саміту кіраўнікі дзяржаў падпісалі пакет дакументаў. Подпісы пад рашэннямі міжнароднага форуму паставіў і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

Ключавы дакумент — Стратэгія развіцця Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва да 2035 года. У стратэгіі вызначаюцца мэты і задачы ШАС, а таксама метады іх дасягнення арганізацыяй да 2035 года. На падставе прынцыпаў і каштоўнасцяў ШАС сфармуляваны задачы па ўмацаванні ўзаемнага даверу і добрасуседства паміж дзяржавамі-членамі; сумесным супрацьстаянні выклікам і пагрозам бяспекі на прасторы ШАС; паглыбленні практычнага супрацоўніцтва ў сферах гандлю, эканомікі, фінансаў і інвестыцый і іншыя.

Вынікі кітайскага старшынства ў ШАС адлюстраваны ў Цяньцзіньскай дэкларацыі.

Прыняты таксама пакет дакументаў па ўзаемадзеянні ў розных сферах. У іх ліку — праграма супрацоўніцтва дзяржаў — членаў ШАС у процідзеянні экстрэмісцкай ідэалогіі на 2026—2030 гады; Дарожная карта па рэалізацыі Стратэгіі развіцця энергетычнага супрацоўніцтва на перыяд да 2030 года.

Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва атрымала статус назіральніка пры Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Лаосу дадзены статус партнёра ШАС па дыялогу. Пры гэтым у рамках ШАС прынята рашэнне аб'яднаць катэгорыі «назіральнік» і «партнёр па дыялогу» ў адзіную катэгорыю «партнёр Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва». Гэта дазволіць аптымізаваць сістэму міжнароднага супрацоўніцтва ШАС.

Па выніках саміту падпісаны два міждзяржаўныя пагадненні — аб стварэнні антынаркатычнага цэнтра ШАС (ён размесціцца ў Душанбэ ў якасці пастаянна дзеючага органа) і аб стварэнні ўніверсальнага цэнтра ШАС па процідзеянні выклікам і пагрозам бяспекі дзяржаў — членаў арганізацыі. Апошні размесціцца ў Ташкенце на базе рэгіянальнай антытэрарыстычнай структуры ШАС таксама ў якасці пастаянна дзеючага органа. Універсальны цэнтр будзе ўключаць Цэнтр інфармацыйнай бяспекі, а таксама цэнтр па супрацьдзеянні міжнароднай арганізаванай злачыннасці ў Бішкеку ў якасці аддзялення.

Горад Чалпон-Ата ў Кыргызстане абвешчаны турыстычнай і культурнай сталіцай ШАС у 2025—2026 гадах.

Прыняты таксама шэраг заяў Савета кіраўнікоў дзяржаў ШАС: у сувязі з 80-годдзем заканчэння Другой сусветнай вайны і стварэння ААН; аб умацаванні супрацоўніцтва ў сферы лічбавай эканомікі; па ўстойлівым развіцці энергетыкі; аб супрацоўніцтве ў галіне зялёнай прамысловасці; аб далейшым паглыбленні міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне штучнага інтэлекту; аб падтрымцы шматбаковай гандлёвай сістэмы; па пытанні эфектыўнага вырашэння сусветнай праблемы наркотыкаў і барацьбы з ёй; аб умацаванні навукова-тэхнічнага і інавацыйнага супрацоўніцтва.



СУПРАЦОЎНІЦТВА

# «ВЫ ПРОСТА МАЛАЙЦЫ — ГІГАНЦКАЕ РАЗВІЦЦЁ КІТАЙСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ!»

## Аляксандр Лукашэнка правёў перагаворы са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам

Знаходзячыся з рабочым візітам у КНР, беларускі лідар у нядзелю, 31 жніўня, правёў сустрэчу са сваім кітайскім калегам у Цяньцзіне.



Фота БелТА

Кіраўнік беларускай дзяржавы высока ацаніў вынікі развіцця Кітая, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта. «Шмат хацелася сказаць, абдумваючы напярэдадні гэту сустрэчу. Але калі бываеш дзесьці, бачыш каласальныя змены літаральна за паўгода-год, забываеш пра тое, што хацеў сказаць. Вы проста малайцы — гіганцкае развіццё Кітайскай Народнай Рэспублікі! Арганізацыя, дысцыпліна, усё па месцы, ніхто дарма нідзе не ходзіць. Людзі займаюцца канкрэтнай справай. Я ў гэтым бачу вялікі поспех вашай дзяржавы і вялікі поспех вашага кіраўніцтва, вашых калег у Кітаі. Усе астатнія пытанні проста цьмянеюць перад тым, што вы робіце ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён адзначыў, што напярэдадні візіту распавёў кітайскім журналістам, як яшчэ ў часы Цзян Цзэміня (быў старшынёй КНР з 1993 да 2003 года) прыязджаў у Кітай і на парадку дня стаяла адно пытанне: «тэхналогіі, тэхналогіі, тэхналогіі». «Я памятаю, мы перадавалі пэўныя тэхналогіі КНР, а цяпер мы вучымся ў вас цалкам па ўсіх кірунках: ад ваенна-прамысловага комплексу да тавараў народнага спажывання», — адзначыў Прэзідэнт.

«Таму вось такія добрыя ўражанні адводзяць на другі план усё, пра што думаеш глабальна. А вы робіце глабальнае з простага. Я вас віншую», — дадаў беларускі лідар.

«Асабіста я ўжо прыйшоў да таго, што і ў палітычным ладзе дзяржавы мы павінны ў вас нешта пераняць. Калісьці Савецкі Саюз і Кітай вельмі дружна выбудоўвалі тую мадэль, якую вы цяпер не страцілі, якая ў вас дзейнічае пры кіраўніцтве Кітайскай Народнай Рэспублікай. Мы, на жаль, шмат што страцілі. І сёння ўжо той, хто над гэтым думае сур'ёзна, разумее, што мы вельмі многае страцілі», — заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Я вас віншую, што вы па-кітайску мудра, акуратна, без рэвалюцый і ўзрушэнняў ведзяце сваю краіну да той мэты, якую вы вызначылі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Старшыня КНР Сі Цзіньпін падчас перагавораў прапанаваў у супрацоўніцтве з Беларуссю засяродзіцца на развіцці прадукцыйных сіл новай якасці.

«Сёння, калі ў свеце адбываюцца найглыбейшыя перамены, чалавецтва зноў знаходзіцца на ростанях. Мы гатовыя з нашымі беларускімі партнёрамі разам выконваць місію часу, ператвараць у жыццё сапраўдную шматбаковасць дзеля міру, развіцця, супрацоўніцтва і ўсеагульнага выйгрышу ва ўсім свеце», — сказаў кітайскі лідар.

Ён адзначыў, што кітайска-беларускія адносіны ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства развіваюцца на высокім узроўні. «У чэрвені мы з вамі сустрэліся ў Пекіне, вырашылі і далей паглыбляць шматпланавае двухбаковае супрацоўніцтва. Прапануем на аснове плённых вынікаў, дасягнутых у рамках гадоў супрацоўніцтва ў галіне навукі, тэхналогій і інавацый, засяродзіцца на развіцці прадукцыйных сіл новай якасці ў інтарэсах развіцця нашых краін», — заявіў Старшыня КНР.

Кітайскі лідар адзначыў, што ў Кітаі гэтымі днямі праходзіць не толькі саміт ШАС, але і юбілейныя ўрачыстасці, прысвечаныя 80-годдзю перамогі над японскім мілітарызмам і заканчэння Другой сусветнай вайны. Прэзідэнт Беларусі будзе прысутнічаць на парадзе, які пройдзе на плошчы Цяньаньмэнь.

«У гады вайны кітайскі і беларускі народы змагаліся плячо ў плячо, зрабілі важкі гістарычны ўнёсак у разгром мілітарызму і фашызму, змацаваўшы паміж сабой непарушную дружбу», — падкрэсліў Сі Цзіньпін.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# «ШАС УПЭЎНЕНА СТАНОВІЦЦА ДЫПЛАМАТЫЧНЫМ ІГРАКОМ ГЛАБАЛЬНАГА ЎЗРОЎНЮ»

## Напярэдадні візіту ў КНР Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў пісьмовае інтэрв'ю кітайскаму інфармацыйнаму агенцтву «Сіньхуа»

Яно было прымеркавана да працоўнага візіту кіраўніка дзяржавы ў Кітай для ўдзелу ў саміце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў Цяньцзіні і ў мерапрыемствах па святкаванні 80-годдзя Перамогі ў Вайне супраціўлення кітайскага народа японскім захопнікам і ў сусветнай антыфашысцкай вайне.

Пытанні Прэзідэнту датычыліся як актуальнага двухбаковага парадку дня, супрацоўніцтва абедзвюх краін, так і глабальных аспектаў развіцця свету, ролі і месца Беларусі і Кітая ў гэтых працэсах. Аляксандр Лукашэнка падрабязна выказаў свой пункт гледжання па пазначаных тэмах.

У прыватнасці, ён падзяліўся сваім бачаннем ролі, якую Беларусь адыгрывае ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, абазначыў кірункі, па якіх Беларусь гатова цесна супрацоўнічаць з кітайскім бокам, агучыў чаканні ад свайго візіту і расказаў, чаму так важна захоўваць гістарычную памяць аб Вялікай Перамозе. Падрабязнасці — у нашым матэрыяле.

### «УСЁ РОБІЦЦА ВЫКЛЮЧНА Ў ІНТАРЭСАХ НАРОДА»: АБ РОЛІ ДЫПЛАМАТЫІ ВЫШЭЙШАГА ЎЗРОЎНЮ

«Старшыня Сі Цзіньпін — не проста кіраўнік вялізнай краіны, вялікага Кітая. Маштаб асобы праяўляецца з часам, і ў Сі Цзіньпіна ён — глабальны, — падкрэслівае беларускі лідар і вось чаму: — У сучаснай зусім не прадказальнай абстаноўцы ён смела бярэ на сябе лідарства і прапануе не толькі Кітаю, але і ўсяму свету ясны і канкрэтны шлях развіцця. У яго ёсць тое, чаму трэба павучыцца многім палітыкам на Захадзе: адказнасць перад сваім народам, стратэгічнае мысленне і жалезная воля. Таму падтрымка яго курсу ў вашай краіне і за яе межамі каласальная».

Аляксандр Лукашэнка звяртае ўвагу, што знаёмы з кітайскім лідарам даўно і ён мысліць стратэгічна, глядзіць на дзесяцігоддзі наперад. На яго думку, пры ўсёй сваёй фундаментальнасці лідар КНР — вельмі сучасны кіраўнік: «Яго дзелавая хватка, працаздольнасць, увага да найдрабнейшых дэталяў, уменне імгненна прымаць рашэнні і ўкараняць усё самае лепшае, новае робіць вашага лідара зразумелым і блізкім для партнёраў па ўсім свеце».

Аляксандр Лукашэнка адзначае і важнасць таго, што Сі Цзіньпін вядзе Кітай шляхам эвалюцыйнага развіцця. Без рэвалюцый, без узрушэнняў, без разбурэння карпатліва створанага папярэднімі пакаленнямі. Усё робіцца паступальна і выключна ў інтарэсах народа.

«Таму кітайская мадэль такая ўстойлівая і з'яўляецца прывабным прыкладам для многіх краін. У процівагу тым, хто спрабуе «прыўнесці дэмакратыю» бомбамі і санкцыямі, Кітай паказвае, што можна развівацца мірна і спакойна, з павагай да іншых дзяржаў».

Што датычыцца дыпламатыі, Аляксандр Лукашэнка агучыў свой пункт гледжання: на лідарах краін заўсёды ляжыць асаблівая роля і вялікая адказнасць. «Можна падпісваць сотні папер, але калі няма даверу, то няма і паслядоўнасці ў рэалізацыі прынятых рашэнняў — гэта ўсё пустое».

### «САПРАЎДНАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ XXI СТАГОДДЗЯ»: АБ ПАДТРЫМЦЫ НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ

Гаворачы пра ролю дыпламатыі на вышэйшым узроўні, Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь і Кітай звязаны найвышэйшай ступенню ўзаемнага даверу і павагі.




А асабістыя кантакты лідараў дзвюх краін даюць магчымасць забяспечыць даверны характар дыялогу, які нішто не заменіць.

«У сучасным свеце менавіта лідары ствараюць палітычную аснову для ўзаемадзеяння, фармулююць агульныя мэты, вызначаючы прыярытэтныя кірункі і пацвярджаючы гатоўнасць да паглыблення кааперацыі, — канстатаваў Прэзідэнт. — Я абсалютна ўпэўнены: беларуска-кітайскае супрацоўніцтва будзе толькі ўмацоўвацца. Мы разам увасабляем у жыццё маштабныя праекты, падтрымліваем адзін аднаго на міжнароднай арэне. Вось гэта і ёсць сапраўдная дыпламатыя XXI стагоддзя».

### «ГЭТА БУДЗЕ НОВЫ ІМПУЛЬС»: АБ ЧАКАННЯХ АД ВІЗІТУ

Адно з пытанняў датычылася чаканняў ад цяперашняга візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай, які для Прэзідэнта Беларусі стаў ужо шаснаццатым.

Так, з цяперашнім візітам кіраўнік дзяржавы звязвае самыя пазітыўныя чаканні. «Па-першае, прайшоў роўна год, як Беларусь далучылася да «шанхайскай сям'і». Цяпер не толькі Кітай падводзіць вынікі свайго старшынства ў арганізацыі, але і Беларусь дае ацэнку першага года сваёй работы ў статусе члена ШАС. Ацэньваюць нас і ўсе краіны-ўдзельніцы, якія паверылі ў шчырыя намеры Рэспублікі Беларусь працаваць на карысць арганізацыі ў імя бяспечнага і ўстойлівага развіцця еўразійскай прасторы», — падкрэсліў ён.

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Несвижский райагросервис»** (Продавец) на праве собственности.

**Электронные торги состоятся 16.09.2025 в 10.00.**

**Лот № 1.** Свеклоуборочный комбайн Holmer Terra Dos 2, заводской № 243808, 2008 г. в.
Начальная цена – 110 160,00 с учетом НДС 20 %.
Задаток – 10 000,00 руб.

**Лот № 2.** Трактор К 701, заводской № 9103073, 1991 г. в.
Начальная цена – 24 282,00 с учетом НДС 20 %.
Задаток – 2 500,00 руб.

**Лот № 3.** LADA 212140, кузов (рама) № XTA212140H2287388, 2017 г. в.
Начальная цена – 12 720,00 с учетом НДС 20 %.
Задаток – 1 200,00 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1–3:**
Минская область, Несвижский район, деревня Рудавка, ул. Ленинская, 162.
Шаг электронных торгов – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 12.09.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона, г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)
по поручению **УП «Коммунальник»**
(продавец, г. Молодечно, ул. Великосельская, 38в, тел. 80176-58-30-14)
проводит открытый аукцион по продаже

**ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ**

**с инв. № 630/D-38765, общей площадью 191,7 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. п. Радошковичи, пл. Гастелло, 1-4.**

**Сведения о земельном участке:**
**кадастровый номер – 623855700002000005, пл. – 0,1720 га.**

Начальная цена без НДС– **32 100,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **3 210,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 50 %.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by.
*Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 02.04.2025, 20.06.2025.*

Аукцион состоится **18.09.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.09.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**
**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
УНН 600029451

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор. Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Арвит-авто». 220026, г. Минск, пр-т Партизанский, 95В (литер Б4/к), к. 32в |
| **Предмет электронных торгов** **Станок универсальный фрезерный ФС250-00,** 1997 г. в., инв. № 112, по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, д. 123. **Начальная цена (с НДС 20 %) – 1 800,00 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов | |
| **Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 03.10.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **02.10.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

# «ШАС УПЭЎНЕНА СТАНОВІЦЦА ГЛАБАЛЬНАГА

*(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)*

Акрамя таго, дадаў Аляксандр Лукашэнка,такі візіт дае яшчэ адну магчымасць для паглыблення стратэгічнага партнёрства Беларусі і Кітая: «Гэта будзе новы імпульс для беларуска-кітайскага супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай сферы, актывізацыі сумесных праектаў у галіне навукі, тэхналогій, прамысловай кааперацыі. Магчыма, нам удасца запусціць новыя кірункі. Таксама не сумняваюся, што візіт стане чарговым пацвярджэннем усепагоднай дружбы і стратэгічнага партнёрства паміж Беларуссю і Кітаем».

Паколькі гэта 16-ы візіт беларускага лідара ў Кітай, то Аляксандр Лукашэнка, можна сказаць, з'яўляецца непасрэдным сведкам развіцця і пераўтварэння гэтай краіны. У сувязі з гэтым у Прэзідэнта спыталі, якія перамены ў КНР яго больш за ўсё ўразілі.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, усе гэтыя гады ён з вялікім інтарэсам назірае за імклівымі і грандыёзнымі пераўтварэннямі Кітайскай Народнай Рэспублікі. «Кожны раз, прыязджаючы ў Кітай, я заўважаю, як імкліва ён мяняецца, і захапляюся, як беражліва тут захоўваюць свае традыцыі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандра Лукашэнку ўражваюць кітайскія мегаполісы з высакахуткасным транспартам і перадавой лічбавай інфраструктурай. Уражальнымі з'яўляюцца і дасягненні Кітая ў сферах, дзе ён ужо стаў сусветным лідарам. Гэта датычыцца, напрыклад, вытворчасці прамысловых робатаў, распрацоўкі беспілотных аўтамабіляў і грузавікоў, развіцця штучнага інтэлекту.

«Асобнага прыгадвання заслугоўваюць касмічная праграма, поспехі ў «зялёнай» энергетыцы і стварэнні магутнай сучаснай прамысловай базы. Адзначаю і тое, з якой увагай Кітай падыходзіць да пытанняў экалогіі і інавацыйнага развіцця. Гэта вельмі важныя кірункі, — упэўнены Прэзідэнт. — А яшчэ я выдатна бачу, якія намаганні, накіраваныя на павышэнне якасці жыцця людзей, краіна прыкладае ў сацыяльнай сферы, у адукацыі і ахове здароўя. Кітай у цэлым найярчэйшы прыклад таго, як можна сумясціць дынамічнае развіццё эканомікі з клопатам пра чалавека».

Беларускі лідар тлумачыць поспех Кітая ў першую чаргу дысцыплінай і працавітасцю кітайскага народа. У гэтым, паводле яго слоў, беларусы вельмі падобны да кітайцаў. Не меншае значэнне мае канфуцыянская калектыўная адказнасць і стратэгічна правільнае кіраўніцтва на чале са Старшынёй Сі Цзіньпінам, дадаў Аляксандр Лукашэнка.

## «ТУТ НАРАДЖАЮЦЦА КАМПЕТЭНЦЫІ»: АБ КЛЮЧАВЫХ КІРУНКАХ, ДЗЕ БЕЛАРУСЬ ГАТОВА ЦЕСНА ПРАЦАВАЦЬ З КІТАЙСКІМ БОКАМ

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што Беларусь у ліку першых уключылася ў кітайскую ініцыятыву «Пояс і шлях», адразу зразумеўшы, што гэта не проста прыгожыя словы, а канкрэтныя магчымасці і перспектывы для эканомікі і людзей. І за мінулыя гады супрацоўніцтва з Кітаем дало адчувальныя вынікі.

Прэзідэнт асабліва адзначыў індустрыяльны парк «Вялікі камень», які Старшыня КНР Сі Цзіньпін называе жамчужынай ініцыятывы «Пояс і шлях». «Для мяне было вельмі важна, каб парк не ператварыўся ў лагістычны цэнтр, а стаў сапраўдным кластарам для навукаёмістых вытворчасцяў. І сёння гэта рабочая пляцоўка, дзе ствараюцца прадпрыемствы з сучаснымі тэхналогіямі, лічбавымі рашэннямі і інавацыйнымі падыходамі. Тут нараджаюцца кампетэнцыі, ствараюцца новыя рабочыя месцы і фарміруецца будучыня эканомікі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паміж краінамі паспяхова рэалізуецца праграма сумесных тэхналагічных праектаў, накіраваная на мадэрнізацыю прамысловасці і паглыбленне кааперацыі ў сферах інавацый і лічбавай эканомікі. Плённа развіваецца супрацоўніцтва ў галіне ўстойлівага развіцця, уключаючы рэалізацыю парадку дня ААН на перыяд да 2030 года. Так, пры падтрымцы кітайскага боку рэалізуецца першы праект у рамках Ініцыятывы па глабальным развіцці, які ажыццяўляецца пры садзейнічанні Фонду глабальнага развіцця і супрацоўніцтва Поўдзень — Поўдзень урада КНР. Гэта «Ахова лясоў Беларусі» — комплексная ініцыятыва па забеспячэнні гатоўнасці да прадухілення і рэагавання на пажары на мясцовым узроўні.

«Беларусь і ў далейшым гатова цесна працаваць з кітайскім бокам па некалькіх ключавых кірунках», — запэўніў Прэзідэнт, пералічыўшы некаторыя з іх. Гэта, напрыклад, паглыбленне сімбіёзу нацыянальных стратэгій развіцця, нарошчванне ўзаемадзеяння ў галінах лічбавай эканомікі, лагістыкі, высокіх тэхналогій, а таксама пошук новых шляхоў для пашырэння гандлёва-эканамічнай інтэграцыі. Будзе прадоўжана ўдасканаленне механізмаў міжурадавага супрацоўніцтва для павышэння эфектыўнасці каардынацыі і рэалізацыі буйных праектаў, забеспячэння іх поўнай адпаведнасці агульным стратэгічным інтарэсам бакоў.

Асаблівы акцэнт будзе зроблены на інавацыях і перадавых тэхналогіях як ключавым драйверы росту эканомікі. «Мы правялі сумесна так званыя Гады супрацоўніцтва ў галінах навукі, тэхналогій і інавацый і запланавалі ўдзяліць дадатковую ўвагу прамысловай кааперацыі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Акрамя таго, плануецца пашыраць гуманітарныя і культурныя абмены, умацоўваючы ўзаемаразуменне і давер паміж народамі Беларусі і Кітая. Паколькі народная дыпламатыя — самая трывалая аснова для доўгатэрміновага развіцця двухбаковых адносін.

## «БЕЛАРУСЬ З САМАГА ПАЧАТКУ ЎБАЧЫЛА ГЭТЫ ПАТЭНЦЫЯЛ І НЕ ПРАГАДАЛА»: АБ ДАЛУЧЭННІ ДА ШАС

Перш за ўсё кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ШАС — гэта арганізацыя, накіраваная ў будучыню. Паводле яго слоў, ва ўмовах пераходу да справядлівага шматпалярнага светаўладкавання асаблівую каштоўнасць уяўляюць адзінства поглядаў удзельнікаў аб'яднання і іх здольнасць прымаць узгодненыя рашэнні. «Беларусь з самага пачатку ўбачыла гэты патэнцыял і не прагадала», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.





«За 20 з лішнім гадоў ШАС сфарміравала ўнікальную мадэль рэгіянальнай бяспекі і развіцця на аснове шматбаковага супрацоўніцтва. Арганізацыя даказала, што пытанні бяспекі можна вырашаць не за кошт канфрантацыі, а праз сумесныя меры», — сказаў Прэзідэнт.

У ліку такіх мер ён назваў абмен разведвальнымі данымі, правядзенне вучэнняў, выбудоўванне даверу паміж дзяржавамі. «Дзякуючы гэтаму ўдалося прадухіліць сотні тэрарыстычных актаў і стварыць сістэму, якая стабілізуе Еўразію», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што было падпісана некалькі ключавых канвенцый, створана Рэгіянальная антытэрарыстычная структура (РАТС), сфарміравана база даных па пагрозах, праведзены сотні сумесных аперацый. Акрамя таго, сістэматычна арганізуюцца вучэнні, каардынуецца работа ў галіне пагранічнага кантролю і барацьбы з транснацыянальнай злачыннасцю. Пасля 2020 года ШАС дадала новыя вельмі важныя кірункі супрацоўніцтва: кібербяспеку, біябяспеку і ахову здароўя насельніцтва.

«Можна сказаць, што ШАС упэўнена становіцца дыпламатычным іграком глабальнага ўзроўню. Арганізацыя прапануе новы падыход да міжнародных адносін, адрозны ад заходніх мадэляў гегемоніі. Дзякуючы «шанхайскаму духу» забяспечваюцца раўнапраўнае супрацоўніцтва і пошук кампрамісаў, — лічыць беларускі лідар. — ШАС інтэгруе ініцыятыву «Адзін пояс, адзін шлях», фарміруе прынцыпы лічбавага кіравання і стварае дыялогавыя платформы для краін, якія сталі на шлях развіцця».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Беларусь актыўна ўключылася ў работу механізмаў бяспекі ШАС, у тым ліку контртэрарыстычных органаў. Ён таксама адзначыў, што беларускі бок запрасіў краіны ШАС падключыцца да падрыхтоўкі Еўразійскай хартыі разнастайнасці і шматпалярнасці ў XXI стагоддзі.

«Беларусь, валодаючы развітой сістэмай пагранічнага кантролю і сучаснымі сродкамі кіберабароны, гатова прапанаваць партнёрам абмен тэхналогіямі і сумесныя вучэнні па абароне крытычнай інфраструктуры ад кібератак», — запэўніў кіраўнік дзяржавы.

# ДЫПЛАМАТЫЧНЫМ ІГРАКОМ ЎЗРОЎНЮ»

## «НАША КРАІНА СТАЛА СУВЯЗНЫМ ЗВЯНОМ У ЭКАНАМІЧНЫХ ПРАЕКТАХ»: АБ РОЛІ БЕЛАРУСІ Ў ШАС

Не менш значны ў дзейнасці ШАС, паводле яго слоў, эканамічны складнік: «Я нават сказаў бы, ён павінен адыгрываць ключавую ролю. Для гэтага нам трэба стварыць эфектыўныя механізмы ўзаемаразлікаў у нацыянальных валютах, развіваць інвестыцыйную інфраструктуру, лагістыку».

Беларускі лідар сказаў, што ўсё большае значэнне набывае гуманітарнае і культурнае супрацоўніцтва. Краіны ўзаемадзейнічаюць у сферах адукацыі, правасуддзя і сацыяльнай абароны, развіваючы «шанхайскі дух» узаемнай павагі. Прэзідэнт адзначыў вялікую і вельмі важную работу Кітая, што пашырае канцэпцыю «супольнасці адзінага лёсу чалавецтва», якая ўплятаецца ў шанхайскую праграму супрацоўніцтва.

«З уступленнем Беларусі ў ШАС колькасць яе членаў павялічылася да дзесяці, і гэта без беспрэцэдэнтнай сціпласці, вядома ж, узмацніла ўплыў арганізацыі на еўразійскай прасторы. Больш таго, наша краіна стала сувязным звяном у эканамічных праектах, паколькі праз нас адкрываюцца новыя маршруты ў Еўропу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

